менение в Банковском кодексе, в котором планируется ввести ряд отдельных статей, посвященных потребительскому кредитованию. Также в кодексе будет перечислена информация, с которой банк будет обязан ознакомить кредитополучателя. Кроме того, будут определены условия досрочного погашения кредита без наличия согласия банка и без уплаты штрафных санкций. Это планируется осуществить с целью урегулирования всех договорных отношений при кредитовании.

Однако для ликвидации противоречий в законодательстве соответствующие изменения должны затронуть не только Банковский, но и Гражданский кодексы Республики Беларусь.

Также необходимо дополнить Закон Республики Беларусь «О рекламе» статьёй, регулирующей рекламную деятельность в сфере финансовых услуг, с целью обеспечения потребителей полной и достоверной информацией о стоимости данной услуги и существенных условиях ее приобретения.

Витебский государственный технологический университет

УДК 747

## ЭВАЛЮЦЫЯ ІНТЭР'ЕРУ: АД МІНУЛАГА ДА СУЧАСНАСЦІ

*Студ. Цурыкава І.А., ст.выкл. Лебедзева С.В.*
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт"*

Дом, хата, сядзіба... Гэта грунт існавання жыцця ўвогуле. Жыллё... З ім звязаны і ад яго залежыць лёс чалавека. Вусная народная творчасць шмат месца адводзіць хатняй тэматыцы. Вывучаючы яе, мы знаходзім той магічны сэнс, які народ надаваў свайму жыллю. Шмат народных абрадаў падкрэсліваюць гэта, а загадкі, прымаўкі, прыказкі – пацвярджаюць. Вобраз дома, хаты – безумоўная адзінка беларускага мастацтва: літаратуры, жывапісу, тэатра. Гэта як твар нашай Радзімы – Беларусі. Творцы ўключаюць у свае працы гэты вобраз, каб быць бліжэй да народа. У мастакоў вобраз хаты выступае сімвалам адзінства з прыродай.

У архаічнай свядомасці кожнае жытло надавала прасторавы сэнс, аддзяляла чалавека ад космасу. У доме як бы суіснавалі чалавек і Сусвет, унутранае і вонкавае, таму станавіліся магчымымі перакадзіроўкі паміж часткамі чалавечага цела, элементамі космасу і дэталямі хаты. У семантыцы традыцыйнай хаты ў значнай ступені закансервавалася ўзаемная праекцыя макра- і мікракосмасу, а ў нормах структуравання адбіліся ўяўленні пра арганізацыю ўласнага свету і спосабы арыентацыі ў ім, што знайшло праяву ў суаднясенні адзначаных элементаў жытла з асноўнымі параметрамі карціны свету. Увесь інтэр'ер хаты адлюстроўваў будову сусвету. Жылая прастора – зямны свет, гарышча – нябёсы. У гэтай структуры ролю самой зямлі, урадлівай глебы выконвала падлога. Падзел хаты на часткі, што адпавядаюць сферам светабудовы, стасаваўся і са знешнім дэкорам хаты. Характэрнае ў гэтым плане дэкаратыўнае вырашэнне фасадаў. Так, афармленне шчыта (франтона) – верхняй трохкутнай часткі будынка – вядзе да небасхілу, па якім рухаецца дзённае свяціла. Таму на шчыце звычайна рабілі сімвалічныя выявы сонца.

Хата – гэта збудаванне, дзе па ўсіх правілах павінна жыць сям'я. І сама канструкцыя, структура хаты атаясамліваецца з так званай сям'ёй. З часам адбываецца пераход да новых тэндэнцый у фарміраванні жылой

прасторы дома. Так, чужынскі "вясковы", пераплятаючыся з нацыянальным стылем афармлення, уяўляе новае і непаўторнае, асаблівае і адметнае, захоўваючы старыя традыцыі і побыт.

Вясковы стыль у інтэр'еры – кірунак, які прыйшоў да нас са ЗША. Як нядзіўна, паняцце "вясковы стыль" узнікла менавіта ў гэтай краіне, гэтак не падобнай на нашу. Тым не менш, ідэі амерыканскіх фермераў знайшлі шырокае ўжыванне на нашых абшарах – наш традыцыйны інтэр'ер вясковай хаты дэманструе вялікае падабенства з заходнім узорам.

Класічны праект вясковай хаты ў стылі кантры – гэты будынак з дрэва і цэглы. Цікава, што ўнутранай планоўкай хата ў вясковым стылі пераймае прыродзе. Пакоі, злучаныя калідорчыкамі, нібы раскіданы па хаце. Некаторыя памяшканні падзелены паміж сабой толькі лёгкімі перагародкамі. Усюды расстаўлена мэбля ў вясковым стылі. Крэслы, канапы, шафы, сталы – у хаце кантры пануе спрадвечна вясковы інтэр'ер.

Зразумела, у першую чаргу папулярны вясковы стыль на дачы. Кантры выдатна спалучаецца з такім будынкам, як руская вясковая лазня. Нядзіўна: вясковы стыль лазні – гэта тое ж дрэва, "што дыхае", якога прытрымліваецца кантры.

Прыжылася ў нашай краіне нават "прыродная" планоўка хат і загарадных катэджаў – "пакоі-палянкі" і "калідоры-сцяжынкі". Менавіта за гэту натуральнасць уладальнікі загарадных участкаў так часта выбіраюць вясковы стыль.

Ва ўнутраным строі такіх хатак таксама дамінуе вясковы стыль. Дызайн сучаснай хаты кантры – гэта хваёвая падлога, простая і якасная драўляная і плеценая мэбля, каміны ў вясковым стылі.

Не меней запатрабаваны вясковы стыль у сучасным ландшафце. Участкі зямлі афармляюцца ў выглядзе палянак, амаль не кранутых чалавекам. Вясковы стыль у дызайне саду – гэта пераход кантры ў адкрытае пераймание натуральнай прыроды. Немагчыма знайсці лепшае месца для дзіцячых гульняў, чым сад у вясковым стылі: тут на час забываецца цывілізацыя і дысцыпліна.

У апошні час вырас попыт на афармленні бараў, крам і рэстаранаў у дадзеным стылі. Аднак, варта адзначыць, што вытокам стылю кантры на Беларусі з'яўляецца простая сялянская хата, якая асацыіруецца з Радзімай, з нечым родным, сваім, бо роднае бліжэй да нашага ўспрымання.

Цяпер, на пачатку XXI стагоддзя, многае змянілася ў жыцці беларускага народа. Змянілася і сялянская хата, яе абсталяванне. Адыйшлі ў мінулае многія старажытныя абрады, што адбываліся ў хаце. Сёння хата ўжо не ўспрымаецца паменшанай мадэллю сусвету. Гэта хутчэй тое, што знакаміты архітэктар мінулага стагоддзя Ле Карбюзье назваў "машынай для жытла".

Дызайнерскае формаўтварэнне сёння шматлікія ідэі чэрпае з навакольнай прыроды, дзе ўсё рацыянальна і лаканічна. Таму стыль кантры з'яўляецца вынікам сінтэзу ўсіх лепшых якасцяў, уласцівых сучасным інтэр'ерам. Гэта магчымасць у наш матэрыяльны і бязлітасны свет жыць у гармоніі з прыродай і разам з тым цешыцца лепшымі момантамі нашага жыцця.

Але калі прашчуры мелі сваю філасофію жылля, што знайшла адлюстраванне ў розных абрадах, звычаях, павер'ях, то і ў нас склалася свая філасофія, якая ўвабрала ў сябе ўсё лепшае з мінулага і поруч з тым засведчыла сённяшні светапогляд.

Витебский государственный технологический университет